(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

УДК 882.6.

**ДАНІЛЕНКА**
Сяргей Іванавіч

# СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ САЦЫЯЛЬНЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ У ТВОРАХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ XIX – XX стст.

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава"
БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2008

Работа выканана ва Установе адукацыі "**Магілёўскі дзяржаўны** універсітэт імя А.А. Куляшова"

| | |
|---|---|
| Навуковы кансультант | **Макарэвіч Аляксандр Мікалаевіч,** доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова" |
| Афіцыйныя апаненты: | **Мальдзіс Адам Іосіфавіч,** доктар філалагічных навук, прафесар (Міжнародная асацыяцыя беларусістаў) |
| | **Штэйнер Іван Фёдаравіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны" |
| | **Кавалёў Сяргей Валер'евіч,** доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта |
| Апаніруючая арганізацыя | УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна" |

Абарона адбудзецца 24 кастрычніка 2008 года ў $14^{30}$ гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-61-40).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "___" верасня 2008 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Хмяльніцкі М.М.

Актуальнасць вывучэння спецыфікі мастацкай стэрэатыпізацыі сацыяльных з'яў тлумачыцца тым, што глыбінная сутнасць неарганічнай мадэрнізацыі аграрнага грамадства – комплексу эканамічных, сацыяльных, культурных змен, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі на рубяжы XIX – XX стст., вельмі часта былі незразумелыя патрыярхальнаму беларускаму сялянству. Таму ў яго свядомасці новыя грамадскія працэсы няўхільнай капіталізацыі жыцця адмоўна стэрэатыпізаваліся, што перадвызначалася асаблівасцямі сінкрэтычнай свядомасці беларускага земляроба. Менавіта гэтую асаблівасць масавага народнага светапогляду і ўвасобілі ў сваіх творах прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты тагачаснага беларускага грамадства, якія імкнуліся найбольш поўна і адэкватна адлюстраваць народныя памкненні да ідэальнага грамадства. Узнікненне новага – савецкага – грамадства, якое мусіла пахаваць свет прыгнёту і ўціску, стаць увасабленнем адвечных народных мар пра справядлівасць, вымагала стварэння літаратуры новага кшталту, якая ў іншых вобразах павінна была ўвасобіць веліч задум пабудовы новага свету дабрыні і справядлівасці – з аднаго боку, цяжкасці, праз якія мусіў прайсці савецкі народ дзеля здзяйснення гэтых задум – з другога. Савецкія пісьменнікі з энтузіязмам узяліся ў 20 – 50-я гг. XX ст. за вырашэнне задачы, пастаўленай перад імі часам. Аднак пераважная большасць "новых" вобразаў, з якіх будавалася сістэма сацыяльных стэрэатыпаў улады савецкай дзяржавы (СССР – ідэальнае царства дабрыні і справядлівасці, вянец гістарычнага развіцця чалавецтва; савецкія кіраўнікі – правадыры, закліканыя здзейсніць адвечную гістарычную наканаванасць, і інш.), ужо мелі надзвычай сталую паводле паходжання і сэнсавага напаўнення традыцыю, з'яўляючыся па сутнасці сваёй вобразамі архетыпічнымі. У гэтым кантэксце вызначэнне архетыпічных сэнсаўтваральных мадэлей у творах беларускай літаратуры і іх гістарычных трансфармацый, скіраваных на мастацкае асэнсаванне сацыяльных фактараў грамадскага развіцця Беларусі XIX – XX стст., з'ўляецца надзвычай важным і актуальным.

Упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве прадметам спецыяльнага даследавання стала спецыфіка адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у мастацкіх творах пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст. Пры гэтым вызначаюцца заканамернасці функцыянавання ментальных архетыпаў успрыняцця рэчаіснасці ў мастацкіх тэкстах, а таксама сацыяльныя працэсы, што прадвызначылі іх актуалізацыю ў літаратурнай творчасці пісьменнікаў дадзенага перыяду. На вобразным і сэнсаўтваральным узроўнях выяўляюцца і сістэматызуюцца асноўныя заканамернасці мастацкага асэнсавання крызісу аграрна-клерыкальнага ладу былой Рэчы Паспалітай у рэчышчы еўрапейскай мадэрнізацыі XIX ст., мастацкай сакралізацыі галоўных атрыбутаў савецкай дзяржаўнасці, дэманізацыі ворагаў савецкага ладу, мастацкага асэнсавання

крызісу камуністычных ідэй. Праведзеныя аналіз, вызначэнне і сістэматызацыя дазволілі выявіць характэрныя рысы творчай манеры пісьменнікаў, іх мастацкага метаду як паказальных асаблівасцей мастацкага адлюстравання неаднародных паводле грамадзянскай рэцэпцыі і ацэнак сацыяльных з'яў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Праца выканана ў адпаведнасці з планавай навуковай тэмай кафедры беларускай літаратуры УА "МДУ імя А.А. Куляшова" "Літаратурны працэс у сучасным асвятленні" (1996 – 2007 гг. выканання).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** дадзенай працы – выявіць спецыфіку мастацкай стэрэатыпізацыі сацыяльных з'яў і працэсаў праз комплекснае і шматузроўневае даследаванне мастацкага засваення рэчаіснасці літаратурай Беларусі XIX – XX стст. У адпаведнасці з акрэсленай мэтай ставіліся наступныя *задачы*:

1. Вызначыць асноўныя заканамернасці стэрэатыпізацыі літаратурна-мастацкага асэнсавання грамадска-палітычных змяненняў, якія адбыліся ў беларускім соцыуме XIX – XX стст.;

2. Раскрыць асаблівасці аксіялагічнай семантыкі сацыяльных стэрэатыпаў, увасобленых у літаратурных тэкстах XIX – пачатку XX ст., а таксама залежнасць сэнсавага напаўнення літаратуры Беларусі новымі сацыяльнымі стэрэатыпамі ад сацыяльнага падзелу тагачаснага грамадства;

3. Вызначыць і ахарактарызаваць ролю зааморфных вобразаў у працэсе мастацкай стэрэатыпізацыі рэчаіснасці літаратурнай традыцыяй Беларусі XIX – XX стст.;

4. Класіфікаваць сэнсаўтваральныя асаблівасці мастацкай сакралізацыі ў беларускай літаратуры савецкай дзяржавы, яе правадыроў, а таксама мастацкай дэманізацыі іх ворагаў паводле агульных заканамернасцей стэрэатыпізацыі;

5. Выявіць і сістэматызаваць асноўныя заканамернасці стэрэатыпізацыі ў творах беларускай літаратуры другой паловы XX ст. праяў крызісу камуністычнай сістэмы каштоўнасцей на сэнсаўтваральным і стылёвым узроўнях.

**Аб'ект** даследавання – творы пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст.: А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, І. Ходзькі, Г. Ржавускага, Ю. Крашэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, К. Сваяка, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, А. Гаруна, М. Чарота, Я. Журбы, К. Крапівы, П. Броўкі, М. Лужаніна, А. Куляшова, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, П. Пестрака, Э. Валасевіча, В. Матэвушава, У. Караткевіча, Л. Рублеўскай, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Я. Янішчыц, М. Башлакова, У. Марука, А. Канапелькі,

С. Законнікава, П. Шруба, М. Мятліцкага, В. Стрыжака, А. Грачанікава, А. Пісьмянкова, У. Паўлава, А. Зэкава, Я. Сіпакова, Я. Хвалея, Г. Марчука, С. Кавалёва, Ю. Станкевіча, Г. Багданавай і інш.

**Прадмет** даследавання – спецыфіка сацыяльнай стэрэатыпізацыі рэчаіснасці ў творах пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. З'яўленне дэманалагічнай вобразнасці ў творах літаратуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. як аднаго са знакавых элементаў стэрэатыпізацыі рэчаіснасці была заканамернай мастацкай рэакцыяй інтэлектуальнай эліты тагачаснага беларускага соцыуму на новыя сацыяльна-палітычныя працэсы мадэрнізацыі, звязаныя з разбурэннем феадальнага ладу. У літаратуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. дэманалагічная вобразнасць выконвала функцыю дэманізацыі новых сацыяльных з'яў, звязаных з развіццём капіталістычных зносін, якія прадвызначалі разбурэнне асноўных сацыяльных, этнічных і гендэрных стэрэатыпаў, што складалі ідэалагічны падмурак жыцця патрыярхальнага беларускага сялянства.

2. Крызіс традыцыйнай "сармацкай" сістэмы сацыяльных стэрэатыпаў патрыярхальнай польска-беларускай шляхты ўвасобіўся ў літаратуры XIX ст. у "неасармацкай" сістэме эстэтычна-каштоўнасных арыентацый ("прыгожае – непрыгожае", "высокае – нізкае", "добрае – злое"), у якой на першы план выходзіла адлюстраванне ірацыянальнай, часта нематываванай амаральнасці, якая ацэньвалася пісьменнікамі "неасармацкай" плыні польска-беларускага рамантызму як нястрымны бунт супраць абмежаванага рацыяналізму пурытанскай капіталістычнай маралі.

3. Развіццё новай беларускай літаратуры пачатку XX ст. вызначылася зацятай і бескампраміснай палемікай "сялянскіх" беларускіх пісьменнікаў з сацыяльнымі стэрэатыпамі прыхільнікаў ідэй "неасарматызму". Гэтым самым пачынальнікі беларускага нацыянальнага адраджэння (Ф. Багушэвіч, К. Сваяк, Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, А. Гарун) паслядоўна і прынцыпова адмаўлялі ролю былой саслоўнай эліты ў справе фарміравання нацыянальна-патрыятычнай самасвядомасці беларускага грамадства ў новых гістарычных умовах.

4. У беларускай літаратуры XIX – XX стст. адным з найбольш знакавых стэрэатыповых мастацкіх увасабленняў перыферыйнага становішча карэннага насельніцтва Беларусі ў капіталістычна-індустрыяльнай сістэме вытворчых зносін з'яўляецца вобраз ваўка-ваўкалака як архетыпічнага сімвала адзіночкі-бунтара.

5. Беларуская савецкая паэзія 20 – 50-х гг. XX ст. стала творчай формай мастацкага ўвасаблення камуністычных ідэй як паказчыкаў новага грамадска-палітычнага вучэння эсхаталагічнай скіраванасці, якое абвяшчала пакутніцкую

і ўратавальную ролю прамысловага пралетарыяту ў стварэнні новага грамадства, пабудаванага па законах дабра і справядлівасці. Пры гэтым у творах беларускіх паэтаў дадзенага перыяду вобраз маладой савецкай дзяржавы ў выніку мастацкай стэрэатыпізацыі набываў вонкавыя рысы апакаліптычнага Царства Божага, а вобразы яе палітычнага кіраўніцтва – вонкавыя прыкметы вышэйшай сакральнай абранасці. У беларускай паэзіі 20 – 50-х гг. ХХ ст. ваенна-палітычнае змаганне савецкай дзяржавы са сваімі ўнутранымі і знешнімі ворагамі набывае акрэсленыя міфалагічныя рысы эсхаталагічнага змагання сіл Дабра і Зла.

6. У беларускай паэзіі 60 – 80-х гг. ХХ ст. адлюстраваны пачатак крызісу савецкай сістэмы сацыяльных стэрэатыпаў, яе маральна-каштоўнасных каардынат, які ўвасобіўся ў паступовай страце гэтай сістэмай свайго эсхаталагічнага напаўнення.

7. Канчатковы крызіс савецкай дзяржаўна-палітычнай сістэмы супаў па часе з буйнейшай тэхнагеннай катастрофай – Чарнобыльскай аварыяй, якая многімі беларускімі паэтамі ў 1986 – 1996 гг. пачала стэрэатыпізавацца як эсхаталагічная падзея, знак Божага пакарання за ранейшае адмаўленне беларускім народам традыцыйных маральна-рэлігійных падмуркаў жыцця на карысць камуністычным ідэалам.

8. Паслядоўнае мастацкае развянчанне сістэмы найбольш знакавых сацыяльных стэрэатыпаў савецкага грамадства, пабудаваных на падмурках камуністычнай сістэмы каштоўнасцей, адбываецца ў творах беларускай літаратуры 60 – 90-х гг. ХХ ст. (“Легенда аб бедным д’ябле і аб адвакатах Сатаны” У. Караткевіча, “Сказ пра Лысую гару” М. Аўрамчыка і Н. Гілевіча, “Здані і пачвары Беларусі” Францішка Хлуса і Марціна Юра і інш.) у адпаведнасці з канонамі карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавай культуры.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае даследаванне з арыгінальнымі палажэннямі і высновамі, выкананае асабіста аўтарам на падставе аналізу шырокага фактычнага літаратурнага і гістарычнага матэрыялу.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прамежкавыя і канчатковыя вынікі даследавання вызначылі змест выступленняў на 11 навуковых канферэнцыях: 1. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Literatury i języki słowian wschodnich. Stan obecny i tendencje rozwojowe” (Аполе, 24 – 26 верасня 1996 г.). 2. Рэспубліканская навуковая канферэнцыя “Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства”, прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння А. Куляшова (Магілёў, 25 – 26 сакавіка 1999 г.). 3. IX Міжнародная навуковая канферэнцыя “Droga ku wzajemności” (Беласток, 20 – 22 ліпеня 2001 г.). 4. Міжнародная канферэнцыя “Dzedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-

bałto-wschodniosłowiańskich. Z języka i kulturz pogranicza” (Беласток, 17 – 18 кастрычніка 2001 г.). 5. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці” (Магілёў, 6 – 7 лютага 2002 г.). 6. XI Міжнародная навуковая канферэнцыя “Droga ku wzajemności” (Беласток, 18 – 20 ліпеня 2003 г.). 7. Другая міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці А.В. Азароўскага (Магілёў, 25 – 26 сакавіка 2005 г.). 8. XIII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Droga ku wzajemności” (Беласток, 15 – 16 ліпеня 2005 г.). 9. Международная научная конференция “Русская и белорусская литературы рубежа XX – XXI веков” (Минск, 25 – 27 апреля 2006 г.). 10. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Куляшоўскія чытанні” (Магілёў, 26 – 27 красавіка 2006 г.). 11. Международная научная конференция “Восточнославянские языки в европейском языковом контексте” (Могилёв, 24 – 25 октября 2007 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 36 публікацыях, сярод якіх 3 манаграфіі – 667 ст. (41,7 друк. арк.); 17 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, – 85 ст. (5,3 друк. арк.); 5 артыкулаў у навуковых зборніках – 38 ст. (2,4 друк. арк.); 11 матэрыялаў навуковых канферэнцый – 101 ст. (6,3 друк. арк.). Агульная колькасць старонак апублікаваных матэрыялаў – 891 (55,7 друк. арк.).

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў і заключэння. Агульны аб’ём дысертацыі – 224 старонкі, у тым ліку – 203 старонкі асноўнага тэксту. Бібліяграфічны спіс уключае 254 пазіцыі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**У першай главе “Спецыфіка адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у творах пісьменнікаў Беларусі XIX – пачатку XX ст.”** вызначаюцца асноўныя заканамернасці зараджэння і паступовага фарміравання канцэптуальных асноў мастацкай сістэмы сацыяльных стэрэатыпаў беларускага грамадства новага часу ў кантэксце традыцыйнай культуры беларусаў.

Першая Рэч Паспалітая, што згінула ў XVIII ст., засталася ў памяці нашчадкаў узорам дзяржаўнага бязладдзя і неразважнасці. Рацыяналістычная Еўропа абсалютысцкіх манархій, эвалюцыя якой была скіравана ў бок пабудовы індустрыяльнага грамадства, не магла зразумець і прыняць культу неабмежаванай палітычнай свабоды старой феадальнай эліты Польшчы і Літвы. Такая свабода прывяла аб’яднаную дзяржаву да заняпаду. У гэтых варунках нават самі дзеячы польскага вызваленчага руху не маглі даць

Афіцыйны пафас савецкай сістэмы каштоўнасцей страціў сваю дзейснасць, аднак савецкі дзяржаўны апарат выдатна разумеў небяспеку смеху для існавання савецкай сістэмы, бо высмейванне яе крызісных праяў павінна было непазбежна прывесці да канчатковага асмяяння яе самой. Ужо ў постсавецкі перыяд на Беларусі з'явіўся шэраг твораў, аўтары якіх (Г. Багданава, С. Кавалёў, Г. Марчук, Ю. Станкевіч і інш.) з розных ідэйных і эстэтычных пазіцый імкнуліся сродкамі інфернальнай вобразнасці пераасэнсаваць знакавыя з'явы савецкай рэчаіснасці і яе сістэмы стэрэатыпаў. Так, Г. Марчук у п'есе "Блудны муж і Варвара" на падмурках карнавальнай эстэтыкі імкнецца рэабілітаваць маральныя і ідэйныя каштоўнасці сацыялістычнай эпохі, іранічна дэманізуючы "д'ябальскія" праявы новага жыцця. У сваю чаргу, у п'есах Г. Багданавай "Рамантычнае падарожжа на той свет", С. Кавалёва "Стомлены д'ябал" і Ю. Станкевіча "Армагедон – 1895" падобнай дэманізацыі ў большай ці меншай ступені падлягае зусім недалёкая савецкая мінуўшчына, якая, на думку аўтараў, і спарадзіла негатыўныя праявы сучаснага ім жыцця. Разам з тым найбольш паслядоўнай і мэтанакіраванай спробай мастацкай дыскрэдытацыі савецкай і камуністычнай духоўнай спадчыны сродкамі смеху ў традыцыях карнавальнай культуры стала кніга "Здані і пачвары Беларусі"(1995) Францішка Хлуса і Марціна Юра.

Такім чынам, пачынаючы з 20-х гг. XX ст. у асэнсаванні сацыяльных з'яў беларуская літаратура прайшла шлях ад сакралізацыі савецкага ладу, дэманізацыі знешніх і ўнутраных ворагаў савецкай краіны да адлюстравання паступовага заняпаду камуністычнай дактрыны. У шэрагу твораў беларускай літаратуры 70 – 90-х гг. XX ст. сістэма сацыяльных стэрэатыпаў савецкага грамадства, пабудаваная на падмурках камуністычнай дактрыны, была асмяяна паводле класічных канонаў карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавай культуры. Разам з тым іранічная дэманізацыя сацыяльных з'яў навакольнага жыцця з'явілася таксама дзейсным сродкам ідэйнай палемікі розных кірункаў грамадска-палітычнай думкі Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў XX ст.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання

**1.** З'яўленне ў творах літаратуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. дэманалагічнай вобразнасці стала заканамерным вынікам мастацкай актуалізацыі і маніфестацыі сістэмы сацыяльных стэрэатыпаў, якія паўсталі ў якасці мастацкай рэакцыі на паступовы заняпад і дэградацыю патрыярхальнага аграрнага соцыума, што з'яўляўся асноўнай апорай дзяржаўнага ладу колішняй Рэчы Паспалітай. Такая асаблівасць адлюстравання стэрэатыпнага ўспрыняцця

няўхільнай мадэрнізацыі і капіталізацыі жыцця ўласціва як прадстаўнікам шляхецкай літаратурнай плыні неасарматызму (А. Міцкевіч, Г. Ржавускі, І. Ходзька, І. Крашэўскі), так і выразнікам інтарэсаў беларускага сялянства (Ф. Багушэвіч, Я. Купала, М. Гарэцкі, А. Гарун) [2; 3; 7; 34].

**2.** Адным з цэнтральных сярод дэманалагічных вобразаў у літаратуры Беларусі XIX – пач. XX ст. з'яўляецца вобраз д'ябла, які выступае ў чатырох іпастасях: антрапазаамарфнай, заамарфнай, антрапамарфнай, нулевамарфнай. Гэтыя іпастасі падкрэсліваюць анталагічную адасобленасць д'ябла ад свету людзей, а таксама яго варожасць сістэме сацыяльных стэрэатыпаў аграрнага грамадства, што адлюстравана ў літаратуры праз наступныя стэрэатыпы:

а) сацыяльныя стэрэатыпы – палярныя дамінанты (маральнае – амаральнае) у грамадскай атмасферы XIX – пач. XX стст. у кантэксце супрацьстаяння стэрэатыпаў індустрыяльнага грамадства, варожых і непрымальных для старасвецкай патрыярхальнай маралі, носьбітам якой была пераважная большасць беларускага сялянства, – акрэсліваюцца ў творах пісьменнікаў Беларусі праз вобраз д'ябла як увасабленне сацыяльнага падзелу грамадства (творы Я. Баршчэўскага, К. Вераніцына, Ф. Багушэвіча, А. Гаруна);

б) этнічныя стэрэатыпы – у сістэме міжнацыянальных зносін, адлюстраваных у тагачасных творах беларускай літаратуры, адмоўны гетэрастэрэатып патрыярхальнага беларускага селяніна ў дачыненні да прадстаўнікоў этнасаў (немцы, яўрэі, рускія і інш.), што займалі больш прывілеяванае становішча ў новай сістэме вытворчых зносін, характэрнай для капіталістычнага ладу жыцця, – увасабляецца ў вобразе д'ябла; пры гэтым крызіс аграрнай сістэмы вытворчасці спрыяў мастацкай дэманізацыі чужынцаў у творах А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, К. Вераніцына, Ф. Багушэвіча, А. Гаруна;

в) гендэрныя стэрэатыпы – крызіс і разбурэнне старой сістэмы вытворчасці непазбежна цягнуў за сабой крызіс патрыярхальнай сям'і і разбурэнне традыцыйнай сістэмы гендэрных стэрэатыпаў аграрнага грамадства; гэта знайшло сваё адлюстраванне са значнай ступенню іранічнай дэманізацыі ў творах А. Рыпінскага, Ф. Багушэвіча, К. Сваяка, А. Гаруна [2; 3; 4; 6; 8; 13; 16; 25; 32].

**3.** Выразнікамі саслоўнай сістэмы каштоўнасцей патрыярхальнай польска-беларускай шляхты сталі польскамоўныя пісьменнікі-рамантыкі неасармацкай плыні. Для неасарматызму як формы мастацкай рэпрэзентацыі шляхецкага сацыяльнага аўтастэрэатыпу было характэрна наступнае: абсалютызацыя каштоўнасцей феадальнага аграрнага грамадства, рэзкае непрыняцце палітычных і культурных змен, выкліканых развіццём капіталістычнага ладу вытворчасці.

Гэтыя асаблівасці грамадскай думкі паўплывалі на сістэму сэнсаўтварэння ў неасармацкай плыні літаратуры польскамоўнага рамантызму

Беларусі XIX ст. (А. Міцкевіч, І. Ходзька, Г. Ржавускі, І. Крашэўскі), для якой уласціва наступнае:

– дамінаванне пэўных літаратурных стэрэатыпаў шляхецкіх авантурыстаў і злачынцаў (Яцак Сапліца, Міхал Валадковіч, Мікалай Патоцкі, Януш Радзівіл (Пане Каханку)), якія ў свой час служылі знакавымі персаніфікацыямі магнацкай злачыннай сваволі;

– выхад на першы план эстэтыкі ірацыянальнай амаральнасці прадстаўнікоў саслоўнай эліты Рэчы Паспалітай перыяду яе крызісу (XVIII ст.), якая станавілася для пісьменнікаў 30 – 40-х гг. XIX ст. крыніцай творчага натхнення;

– у лёсах саслоўнай эліты канца XVIII ст. пісьменнікі неасармацкай плыні бачылі творчую метафізічную патэнцыю бунту супраць абмежаванага рацыяналізму капіталістычнай маралі, якую ўвасаблялі прыхадні на тэрыторыі Беларусі;

– неасармацкая злачынная амаральнасць спалучалася ў мастацкай стэрэатыпнай свядомасці польскамоўных рамантыкаў з падкрэсленым клерыкалізмам, персаніфікуючы месіянскую скіраванасць польскай шляхецкай ідэі – вечнай Залатой Вольнасці [2; 3; 5; 21; 28; 31; 35].

**4.** Беларуская літаратура XX ст. творча пераасэнсавала здабыткі польскамоўнага рамантызму неасармацкай плыні (А. Міцкевіч, І. Ходзька, Г. Ржавускі, Ю. Крашэўскі), выкарыстоўваючы яго сістэму стэрэатыпаў і найбольш знакавыя вобразы: шляхціц-сваволькік, сармацкая "фантазія", ахвяра шляхецкага гвалту, пакаянне і пакаранне. Гэтыя стэрэатыпы і вобразы ў творах беларускіх пісьменнікаў XX ст. атрымалі амаль адваротную ў параўнанні з творамі пісьменнікаў неасармацкай плыні мастацкую ацэнку і інтэрпрэтацыю як праявы сацыяльнага гвалту і ўціску. У творах Я. Купалы, М. Гарэцкага, У. Караткевіча, Л. Рублеўскай і іншых прадстаўнікі шляхецкага стану свядома і мэтанакіравана дэманізуюцца. Тым самым гэтыя і іншыя пісьменнікі паслядоўна і прынцыпова адмаўлялі ў працэсе фарміравання самасвядомасці беларусаў як прадстаўнікоў маладой еўрапейскай нацыі ролю такога яе складніка, як былая саслоўная эліта [2; 3; 5; 15; 18; 20; 31; 35].

**5.** Адасобленае становішча карэннага насельніцтва Беларусі ў новай капіталістычна-індустрыяльнай сістэме вытворчых зносін знайшло сваё мастацкае ўвасабленне і ў вобразе ваўка (ваўкалака) як архетыпічнага стэрэатыпнага вобраза адвечнага выгнанца і бунтара. У літаратуры Беларусі XIX – пач. XX стст. з'яўляюцца два віды вобразаў ваўкалакаў. Першы ўвасабляе продкаў, заснавальнікаў дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага (вобразы князёў-ваўкалакаў, што абараняюць айчыну ад яе ворагаў – творы А. Міцкевіча, Я. Чачота), другі – пакутных выгнанцаў, што знаходзяцца ў канфлікце з соцыумам з-за недасканаласці яго законаў, далёкіх ад Закона

Божага (яны не могуць знайсці ў сабе сілы для радыкальнага і дзейснага выступлення супраць варожага ім жыцця – творы П. Багрыма, Я. Баршчэўскага, А. Абуховіча, Я. Купалы).

У савецкай жа беларускай літаратуры (напрыклад, творы Я. Коласа і У. Караткевіча) стэрэатыпнымі рысамі ваўкалакаў надзяляюцца паўстанцы, якія са зброяй у руках адстойваюць свой сацыяльны ідэал. Вобраз ваўкалака як персанажа беларускай савецкай літаратуры з'яўляецца па сутнасці вынікам сінтэзу дзвюх "класічных" іпастасей (продак-абаронца і выгpiаннік) гэтага міфалагічнага вобраза. З аднаго боку, паводле сваёй дзейснасці ён падобны да колішніх абаронцаў Айчыны, "князёў-ваўкалакаў", з іншага боку, падобна да ваўкалака-ахвяры, з'яўляецца выгнаннікам, адасобленым ад соцыума [2; 3; 30].

**6.** На змест, вобразнасць і асаблівасці мастацкага сэнсаўтварэння ў беларускай літаратуры 20 – 50-х гг. XX ст. паўплывала перамога на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ідэй камунізму – грамадска-палітычнага вучэння эсхаталагічнай скіраванасці, якое абвяшчала ахвярную і ўратавальную ролю ў сусветнай гісторыі прамысловага пралетарыяту.

У сувязі з акрэсленым вышэй у творах беларускіх паэтаў гэтага перыяду (Я. Купала, Я. Колас, А. Куляшоў, П. Панчанка, П. Глебка, Ц. Крысько, Я. Журба і інш.) маладая савецкая дзяржава разам са сваёй сталіцай у выніку мастацкай стэрэатыпізацыі набыла акрэсленыя фармальныя рысы апакаліптычнага Царства Божага, увасобленага ў свой час на старонках Бібліі. Мастацкія вобразы ўладароў савецкай краіны вызначаюцца фармальнымі архаічнымі прыкметамі вышэйшай сакральнай абранасці (уладар "царства справядлівасці" – гэта і салярны ўсепраніклівы дух плоднасці, і гарант дабрабыту і бяспекі, і ахвярны даравальнік несмяротнасці, і грозны суддзя). У той жа час унутраныя і знешнія ворагі СССР стэрэатыпна ўвасабляюцца ў вобразах жывых мерцвякоў, выступаюць персаніфікацыямі рознага роду пошасцей, "нячыстых" жывёл (творы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Панчанкі, П. Глебкі і інш.) [1; 3; 9; 10; 11; 12; 14; 19; 24; 33; 34].

**7.** У 60 – 80-х гг. XX ст. з усёй відавочнасцю вызначыўся пачатак крызісу савецкай сістэмы каштоўнасцей. Замест ранейшага ўслаўлення перспектыў камуністычнага грамадства адбываецца спроба абароны "старых" агульначалавечых каштоўсцей, якімі "крывадушна" прыкрываюць сваю чалавеканенавісніцкую сутнасць заходнія капіталістычныя "фарысеі". На змену старым ворагам – крыважэрным "злавесным мерцвякам", прадстаўнікам аджылага свету ("генералам", "панам-упырам", "крывавым замежным бандзітам" і інш.), якія беспаспяхова імкнуцца ўварвацца ў светлы "сад" Савецкай краіны, – у беларускую паэзію гэтага перыяду паступова прыходзіць стэрэатып новых ворагаў – "несапраўдныя" святары, якія толькі на словах

служаць Богу дабрыні і справядлівасці, з'яўляючыся на самой справе служкамі Д'ябла і "залатога цяльца", напоенага людскімі пакутамі і крывёй бязвінных ахвяр (творы М. Танка, П. Панчанкі, Я. Янішчыц, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, В. Зуёнка, С. Грахоўскага і інш.) [1; 3; 23].

**8.** Канчатковы крызіс і заняпад савецкай дзяржаўна-палітычнай сістэмы і яе сістэмы стэрэатыпаў супаў у часе з Чарнобыльскай аварыяй. Невымерны для чалавечага розуму маштаб гэтай тэхнагеннай катастрофы спарадзіў унікальны вопыт мастацкага асэнсавання беларускай літаратурай трагедыі свайго народа ў першае "чарнобыльскае" дзесяцігоддзе. Сутнасць яго ў наступным: Я-свядомасць пісьменніка адасабляецца ад пазіцыі староннягa назіральніка, у ёй сканцэнтраваная апакаліптычная скіраванасць свядомасці значнай часткі беларускага грамадства канца 80-х гг. XX ст. (паэтычныя творы Э. Акуліна, М. Башлакова, А. Грачанікава, К. Жука, А. Зэкава, А. Канапелькі, У. Марука, М. Мятліцкага, С. Панізніка, У. Паўлава, А. Пісьмянкова, Я. Сіпакова, В. Стрыжака, П. Шруба, Я. Хвалея і інш.), радыяцыйнае забруджанне тэрыторыі Беларусі, што нясло смяротную небяспеку яе насельніцтву, асэнсоўваецца праз каноны біблейскага архетыпу ("Апакаліпсіс", "Плач Іераміі", вавілонскі палон, Іудаў праклён і інш.) як непасрэднае Божае пакаранне за адступленне ад хрысціянскіх падмуркаў жыцця [1; 3; 26; 27].

**9.** Рашучае і паслядоўнае развянчанне сістэмы сацыяльных стэрэатыпаў савецкага грамадства, пабудаванага ў адпаведнасці з камуністычнай дактрынай, адбываецца ў шэрагу твораў беларускай літаратуры 60 – 90-х гг. XX ст. (творы У. Караткевіча, С. Кавалёва, Г. Багданавай, Ю. Станкевіча і інш.). У гэтых творах выразна праявіліся сэнсаўтваральныя і стылёвыя асаблівасці, характэрныя ў першую чаргу для сатырычнай літаратуры постмадэрнізму:

– адмаўленне праз утрыраванае адлюстраванне прыватных падзейна-літаратурных сітуацый узвышанай сутнасці прататыпных з'яў, характараў, вобразаў;

– абсурднае адлюстраванне сутнасці літаратурных фактаў, падзей і ў іх кантэксце – памкненняў літаратурных герояў;

– эпатажнасць адлюстравання, якая грунтуецца на спалучэнні неспалучальных з'яў;

– актыўнае ўжыванне гратэскавых, вітальных, гіпербалічных эпізодаў і вобразаў.

Савецкая аксіялагічная спадчына характарызуецца паводле класічных канонаў карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавой культуры (гіпербалізацыя, травестацыя, віталізацыя) у ананімных творах "Сказ пра Лысую гару" Ведзьмака Лысагорскага і "Здані і пачвары Беларусі" Францішка Хлуса і Марціна Юра. Тут у першую чаргу асмяянню падверглася камічная неадпаведнасць высокіх ідэалаў, што абвяшчаліся савецкім кіраўніцтвам і яго

прапагандысцкім апаратам, паўсядзённым рэаліям жыцця простага савецкага чалавека з яго надзённымі патрэбамі і памкненнямі [1; 3].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Праведзенае даследаванне істотна ўдакладняе і канкрэтызуе традыцыйную характарыстыку асноўных заканамернасцей развіцця літаратуры Беларусі XIX – XX стст. Тэарэтычныя абагульненні і высновы могуць служыць навуковым падмуркам для далейшых даследаванняў як новай, так і старажытнай беларускай літаратуры, больш шырокага выяўлення і характарыстыкі заканамернасцей і шляхоў развіцця літаратурнага працэсу Беларусі. Фактычны матэрыял дысертацыі, яе асноўныя палажэнні і высновы могуць быць выкарыстаны пры стварэнні падручнікаў па гісторыі беларускай літаратуры і навуковых дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, пры падрыхтоўцы лекцый, спецкурсаў і спецсемінараў па беларускай літаратуры XIX і XX стст.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

## Манаграфіі

1. Даніленка, С.І. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці: манаграфія / С.І.Даніленка. – 2-е выд. – Магілёў: Бел.-Рас. ун-т, 2005. – 229 с.

2. Даніленка, С.І. Міф Адраджэння: харунжыя Бога. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. у кантэксце яе інфернальнай вобразнасці: манаграфія / С.І. Даніленка. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2005. – 180 с.

3. Даніленка, С.І. Спецыфіка адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у творах пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст.: манаграфія / С.І. Даніленка. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 258 с.

## Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК

4. Даніленка, С.І. Адзін з сялянскіх этнічных стэрэатыпаў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст.: чужынец як чорт ці д'ябал / С.І. Даніленка // Веснік БДУ. Навукова-тэарэтычны часопіс Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 4. – 2005. – № 3. – С. 41 – 45.

5. Даніленка, С.І. Адлюстраванне ідэй польскага месіянізму ў аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" / С.І. Даніленка // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. – 2005. – № 4 (20).– С. 191 – 195.

6. Даніленка, С.І. Асаблівасці асэнсавання гендэрных стэрэатыпаў у кантэксце інфернальнай вобразнасці беларускай літаратуры XIX – пач. XX стагоддзя / С.І. Даніленка // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2005. – № 7. – С. 157 – 164.

7. Даніленка, С.І. Дэманізацыя вынікаў царскай палітыкі ў беларускай парэформеннай публіцыстыцы / С.І. Даніленка // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, псіхалогія, правазнаўства, філалогія. – 2005. – № 4 (35). – С. 125 – 132.

8. Даніленка, С.І. Д'ябал як сацыяльны персанаж беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст. / С.І. Даніленка // Вестник Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1. – С. 160 – 165.

9. Даніленка, С.І. Мастацка-публіцыстычная дэманізацыя ворагаў СССР у лірыцы Якуба Коласа канца 40-х – пач. 50-х гг. XX ст. / С.І. Даніленка // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава. – 2005. – № 4 (38). – С. 80 – 84.

10. Даніленка, С.І. Мастацкая дэманізацыя фашысцкіх захопнікаў у лірыцы беларускіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны / С.І. Даніленка //

Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава. – 2005. – № 4 (38). – С. 85 – 89.

11. Даніленка, С.І. Міфалагізацыя змагання з ворагамі новага жыцця ў беларускай паэзіі 30 – 50-х гг. ХХ ст. / С.І. Даніленка // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – 2005. – № 4. – С. 79 – 81.

12. Даніленка, С. І. Міфалагічны матыў “ганебнага” пахавання ў лірыцы беларускіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны / С.І. Даніленка // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – 2005. – № 2 – 3. – С. 95 – 97.

13. Даниленко, С.И. Особенности осмысления гендерных стереотипов в контексте инфернальной образности белорусской литературы XIX – XX вв. / С.І. Даниленко // Вестник Тульского государственного педагогического университета им. Л.Н. Толстого. Гуманитарные науки. – 2005. – № 3.– С. 223 – 231.

14. Даніленка, С.І. Хрысціянска-біблейскія алюзіі ў патрыятычнай лірыцы беларускіх савецкіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны / С.І. Даніленка // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – 2005. – № 2 (13). – С. 72 – 75.

15. Даніленка, С.І. Асаблівасці нацыянальнай гісторыі ў прозе У.Караткевіча / С.І. Даніленка // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. – 2006. – № 2 (22). – С. 219 – 224.

16. Даніленка, С.І. Вобраз д’ябла як персаніфікацыя ксенафобіі патрыярхальнага беларускага сялянства ў беларускай літаратуры XIX – пач. ХХ стагоддзя / С.І. Даніленка // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2006. – № 1. – С. 105 – 108.

17. Даніленка, С.І. Заморфная іпастась д’ябла ў беларускай літаратуры XIX – пач. ХХ ст. / С.І. Даніленка // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, псіхалогія, правазнаўства, філалогія. –2006. – № 1 (36). – С. 93 – 96.

18. Даніленка, С.І. Топас радавых партрэтаў у аповесці Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха” / С.І. Даніленка // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова – 2006. – № 1 (23). – С. 124 – 127.

19. Даніленка, С.І. Топіка “Скалы” ў патрыятычнай лірыцы беларускіх савецкіх паэтаў / С.І. Даніленка // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – 2006. – № 1 (14). – С. 69 – 73.

20. Даніленка, С.І. Мастацкія асаблівасці адлюстравання шляхецкага гетерастэрэатыпа ў апавяданні Л. Рублеўскай “Гайвароны” / С.І. Даніленка // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова – 2008. – № 1 (29). – С. 92 – 96.

**Артыкулы ў навуковых зборніках:**

21. Даніленка, С. Новыя архіўныя звесткі аб продках Адама Міцкевіча / С. Даніленка // Terra Alba. T. 2. Homo venerius: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад рэд. С.І. Даніленкі; Магілёўс. т-ва гуманіт. інтэлектуал. і культур. ініцыятыў "Брама". – Мінск: Экаперспектыва, 2001. – С. 224 – 227.

22. Даніленка, С.І. Адлюстраванне ідэалогіі неасарматызму ў літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка // КРАЙ = KRAJ: (Polonica-Albaruthenica-Lithuanica): 1-2 (4-5) / Рэд. Я. Іваноў; ГА МТ "Брама". – Мінск: Энцыклапедыкс, 2002. – С. 72 – 80.

23. Даніленка, С.І. Дэманізацыя знешніх ворагаў СССР у беларускай паэзіі 60 – 80-х гг. XX ст. / С. Даніленка // У ракурсе сучаснага асэнсавання: міжкафедральны зборнік навуковых прац, прысвечаны 90-годдзю МДУ імя А.А. Куляшова. Філалогія. Вып. 1. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – С. 11 – 20.

24. Даніленка, С.І. Паэма Міхася Чарота "Ленін" у кантэксце сакралізацыі постаці правадыра сусветнага пралетарыяту / С. Даніленка // У ракурсе сучаснага асэнсавання: міжкафедральны сборнік навуковых прац. Філалогія. Вып. 2. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – С. 14 – 23.

25. Даніленка, С.І. Антрапазаморфная, антрапаморфная іпастасі д'ябла ў беларускай літаратуры XIX ст. / С.І. Даніленка // Вестник Могилевского государственного технического университета. – 2005. – № 1. – С. 60 – 65.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый:**

26. Даніленка, С. Аб Мёртвых Землях, сакральным мараходстве і чашы Святога Прычасця (Рытуальна-міфалагічныя вытокі творчасці У. Караткевіча) / С. Даніленка // Literatury i języki słowian wschodnich. Stan obecny i tendencje rozwojowe: materiały międzynarodowej konferencji naukowej. Opole, 24 – 26 września 1996. – Opole, 1997. – T. I. – S. 102 – 105.

27. Даніленка, С.І. Архаічныя метафары ініцыяцыі ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча / С. Даніленка // Terra Alba I. Праблемы беларускага літаратуразнаўства: (Да 85-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова). – Мінск: Маладзёжнае навуковае таварыства, 2000. – С. 147 – 153.

28. Даніленка, С.І. Ідэалогія неасарматызму ў літаратуры Беларусі / С. Даніленка // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці", 6 – 7 лютага 2002 г. – Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2002. – С. 32 – 34.

29. Даніленка, С. Адлюстраванне ідэалогіі неасарматызму ў літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка // "Dzedzictwo przeszłości

związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. Z języka i kulturz pogranicza"– Białystok, 2002. – T. VIII. – S. 45 – 51.

30. Даніленка, С. Воўк і ваўкалак у літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка // Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: materiały IX Międzynarodowej Konferencji Naukowej „Droga ku wzajemności". Białystok 20 – 22. VII. 2001. – Białystok, 2002. – С. 199 – 208.

31. Даніленка, С. "Антысармацкі" пафас аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" ў кантэксце літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка // Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: materiały XI Międzynarodowej Konferencji Naukowej „Droga ku wzajemności". Białystok 18 – 20. VII. 2003. – Białystok, 2004. – С. 251 – 274.

32. Даніленка, С. Дэманізацыя сацыяльных зносін у літаратуры Беларусі XIX – пачатку XX стст. / С. Даніленка // Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: materiały XIII Międzynarodowej Konferencji Naukowej „Droga ku wzajemności". Białystok 15 – 16. VII. 2005. – Białystok, 2006. – С. 39 – 52.

33. Даніленка, С.І. Мастацкая дэманізацыя Ватыкана ў лірыцы Якуба Коласа канца 40-х – пачатку 50-х гг. XX стагоддзя / С. Даніленка // Материалы II Международной научной конференции, посвященной памяти О.В. Озаровского (1935 – 1995), проводимой в рамках "Кулешовских чтений" (25 – 26 марта 2005 г.). – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 83 – 85.

34. Даніленка, С.І. Мастацкая дэманізацыя капіталізму ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX ст. / С. Даніленка // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навук. канф., 26 – 27 красавіка 2006 г. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – С. 35 – 43.

35. Даніленка, С.І. Мастацкая палеміка ідэйных напрамкаў "сарматызму" і "антысарматызму" ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. / С. Даніленка // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навук. канф., 26 – 27 красавіка 2006 г. - Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – С. 240 – 243.

36. Даніленка, С.І. Літаратуразнаўчы аспект праблемы адлюстравання эвалюцыі сацыяльных стэрэатыпаў у працэсе мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства (у праекцыі на творы беларускіх пісьменнікаў XIX – XX стст.) / С. Даніленка // Восточнославянские языки в европейском языковом контексте: сборник научных статей по материалам Международной научной конференции (24 – 25 октября 2007 г.) – Могилев: МГУ им А.А. Кулешова, 2007. – С. 230 – 243.

# РЭЗЮМЭ

**Даніленка Сяргей Іванавіч**

**Спецыфіка адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у творах пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст.**

*Ключавыя словы:* сацыяльныя стэрэатыпы, этнічныя стэрэатыпы, гендэрныя стэрэатыпы, сакралізацыя, дэманізацыя, архетып, вобраз ворага, неасарматызм, патрыярхальнае грамадства, традыцыйная культура, эсхаталагізм, біблейскі кантэкст.

*Даследуецца* спецыфіка сацыяльнай стэрэатыпізацыі рэчаіснасці ў творах пісьменнікаў Беларусі XIX – XX стст.

*Мэта дысертацыйнага даследавання* – выявіць спецыфіку мастацкай стэрэатыпізацыі сацыяльных з'яў і працэсаў праз комплекснае і шматузроўневае даследаванне мастацкага засваення рэчаіснасці літаратурай Беларусі XIX – XX стст.

*Метадалагічная аснова працы.* Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся асноўныя прынцыпы рытуальна-міфалагічнай крытыкі і параўнальна-гістарычнага метаду.

*Асноўныя вынікі і навізна.* Упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве зроблены сістэмны і цэласны аналіз спецыфікі адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у мастацкіх творах XIX – XX стст. Вызначаюцца заканамернасці функцыянавання ментальных архетыпаў успрыняцця рэчаіснасці ў мастацкіх тэкстах, а таксама сацыяльныя працэсы, што прадвызначылі іх актуалізацыю ў літаратурнай творчасці пісьменнікаў дадзенага перыяду. На вобразным і сэнсаўтваральным узроўнях выяўляюцца і сістэматызуюцца асноўныя заканамернасці мастацкага асэнсавання крызісу аграрна-клерыкальнага ладу былой Рэчы Паспалітай у рэчышчы еўрапейскай мадэрнізацыі XIX ст., мастацкай сакралізацыі галоўных атрыбутаў савецкай дзяржаўнасці, дэманізацыі ворагаў савецкага ладу, мастацкага асэнсавання крызісу камуністычных ідэй. Праведзеныя аналіз, вызначэнне і сістэматызацыя дазволілі выявіць характэрныя рысы творчай манеры пісьменнікаў, іх мастацкага метаду як паказальных асаблівасцей мастацкага адлюстравання неаднародных паводле грамадзянскай рэцэпцыі і ацэнак сацыяльных з'яў.

Матэрыялы і навуковыя вынікі дысертацыі, што характарызуюцца канцэпцыйнай завершанасцю і цэласнасцю, могуць служыць метадалагічнай асновай для далейшага вывучэння праблем адлюстравання сацыяльных стэрэатыпаў у літаратуры, выкарыстоўвацца ў вучэбна-педагагічным працэсе.

# РЕЗЮМЕ

## Даниленко Сергей Иванович

## Специфика отражения социальных стереотипов в произведениях писателей Беларуси XIX – XX вв.

*Ключевые слова:* социальные стереотипы, этнические стереотипы, гендерные стереотипы, сакрализация, демонизация, архетип, образ врага, неосарматизм, патриархальное общество, традиционная культура, эсхатологизм, библейский контекст.

*Исследуется* специфика социальной стереотипизации действительности в произведениях писателей Беларуси XIX – XX вв.

*Цель диссертационного исследования* – выявить специфику художественной стереотипизации социальных явлений и процессов через комплексное и многоуровневое исследование художественного освоения действительности литературой Беларуси XIX – XX вв.

*Методологическая основа работы.* Для решения поставленных задач использовались основные принципы ритуально-мифологической критики и сравнительно-исторического метода.

*Основные результаты и новизна.* Впервые в отечественном литературоведении осуществлен системный и целостный анализ специфики отражения социальных стереотипов в художественных произведениях XIX – XX вв. Определяются закономерности функционирования ментальных архетипов восприятия действительности в художественных текстах, а также социальные процессы, которые предопределили их актуализацию в литературном творчестве писателей данного периода. На образном и смыслообразующем уровнях определяются и систематизируются основные закономерности художественного осмысления кризиса аграрно-клерикального строя бывшей Речи Посполитой в русле европейской модернизации XIX в., художественной сакрализации главных атрибутов советской государственности, демонизации врагов советского строя, художественного осмысления кризиса коммунистических идей. Проведенные анализ, определение и систематизация позволили выявить характерные черты творческой манеры писателей, их художественного метода как показательных особенностей художественного отражения неоднородных по своей гражданской рецепции и оценкам социальных явлений.

Материалы и результаты диссертации могут служить методологической основой для дальнейшего изучения проблем отражения социальных стеретипов в литературе, использоваться в учебно-педагогическом процессе.

# SUMMARY

**Danilenka Siarhei Ivanavich**

## SPECIFICATION OF THE SOCIAL STEREOTYPES REFLECTION IN BELARUSIAN WRITERS' WORKS OF XIX – XX CENTURIES

*Main words:* sacral stereotypes, ethnical stereotypes, hender stereotypes, sacralisation, demonization, archetype, enemy's image, neosormatism, patriarchal society, traditional culture, eschatologism, bible context.

*Research of:* social stereotypes of reality specification in Belarusian writers' works of XIX – XX centuries.

*Research aim.* Determination of art stereotypes specification of social phenomena and processes by means of complex and poly-level research of reality art mastering by Belarusian literature of XIX – XX centuries.

*Methodological base of the research.* To decide research tasks the main principles of ritual-mythical critic and comparative-historical research method were used.

*The main results and novelty.* For the first time in the Belarusian history and criticism of literature the systematic and complete analysis of specification of the social stereotypes reflection in the XIX – XX century's works of literature in context was conducted. Conformities to natural laws of the mental archetypes of reality perception in literature texts functioning, and social processes anticipated its actualization in the writers' literature work at given time were defined. The main conformities to natural laws of art comprehension of the agrarian-clerical system crisis in former Rech Pospolitaya in channel of European XIX century modernization, art sacralisation of the Soviet state main attributes, Soviet system enemies demonization, communistic ideas crisis comprehension were defined and systematized at image and sense levels. Conducted analysis, definition and systematization allowed to find out the characteristic traits of writers' art manner, art method as the significant peculiarities of art reflection of the social phenomena, which is not homogeneous in civil receptions and values.

The dissertation materials and science results have conception completion unity and can be used as methodological base for further social stereotypes in literature problems research, and be integrated in educational and pedagogical process.

